УДК 821.161.3

**Т. І. Шамякіна** (Мінск)

# МАРА ЯК КУЛЬТУРНЫ КАНСТРУКТ (на матэрыяле паэмы Якуба Коласа "Новая зямля")

Паняцце "культурны канструкт" пакуль не ўжываецца ў беларускім навуковым дыскурсе. Але яно з'явілася ў еўрапейскай, у расійскай культурнай прасторы, хоць яшчэ і не сцвердзілася ў дэфініцыі – розныя даследчыкі ўкладаюць у яго розны сэнс. Мы разумеем культурны канструкт як паняцце, якое ў той ці іншай ступені характарызуе духоўнае быццё чалавека як *родавай* істоты; тую з культурных традыцый, што дазваляла людзям адаптавацца і выжываць у прыродным і сацыяльным свеце. Культурны канструкт – "вынік групавога адбору, што адбываўся на працягу многіх дзесяткаў і сотняў гадоў" [1, с. 12]. Прычым у іерархіі каштоўнасцей розных народаў можна заўважыць аднолькавыя з'явы і прадметы. Напрыклад, заўсёды шанавалася тое, што звязана з небам, любоўю, прыгажосцю, ісцінай, вечнасцю. А паколькі людзі і марылі заўсёды (што і рабіла іх людзьмі), то мэтазгодна лічыць паняцце "мары" культурным канструктам.

Мара, як мы лічым, – вера ў невядомае і спадзяванне на яго, перажыванне таго, што яшчэ не адбылося; не прадбачанне, а *пачуццё* будучага. Калі б не мары, нішто не магло б прымусіць людзей *дзейнічаць* для ажыццяўлення жаданага будучага.

Агульным месцам з'яўляецца паняцце "амерыканская мара". У апошні час пра "рускую мару" шмат піша вядомы на постсавецкай прасторы пісьменнік і грамадскі дзеяч Аляксандр Праханаў. Так, ён адзначае: "Усе народы свету – летуценнікі. У кожнага народа ёсць свая мара. Яна дазваляла народу прайсці праз тысячагоддзі і не знікнуць. А народы, якія страцілі мару, зніклі. Часам мара афармлялася ў эпасе, выяўлена ў словах, у тых ці іншых словах" [4, с. 3].

Беларуская мара ў найбольшай ступені – як *нацыянальная ідэя* – выяўлена ў нацыянальным літаратурным шэдэўры, айчынным эпасе – паэме Якуба Коласа "Новая зямля". Прычым не толькі глыбінная ідэя – і стрыжнем *сюжэту* ў творы таксама з'яўляецца мара.

Жыццё і творчасць Якуба Коласа нельга разглядаць у адрыве ад яго эпохі. Якуб Колас сфарміраваны часам, асяроддзем, і сам стаў іх, часу, гісторыі, асяроддзя, яркім выразнікам. Час яго фарміравання як пісьменніка – пачатак XX ст. – цікавы і для нас, людзей XXI ст., таму што ў гістарычным працэсе і ў духоўным жыцці грамадства назіраецца не толькі лінейнасць, але і *цыклізм*: некаторыя тэндэнцыі сацыяльнага, палітычнага, мастацкага жыцця маюць схільнасць да паўтарэння. Так, філосафы заўважылі, што ў пачатку любога стагоддзя абвастраецца цікавасць людзей да пытанняў маральна-этычных і псіхалагічных, а ў канцы стагоддзя – да рэлігійна-філасофскіх і касмалагічных. Увогуле, тое, што было адкрыта ў пачатку каляндарнага веку, павінна быць *асэнсавана* ў яго канцы. Акрамя таго, у пачатку XX ст. чуйныя да токаў космасу і гісторыі людзі адчувалі катастрафічнасць, крызіснасць быцця. А сёння, у пачатку XXI ст., пра крызіс гавораць ужо ўсе. І справа не толькі ў фінансава-эканамічным крызісе, а ў крызісе самога прынцыпу жыцця, пабудаванага на несправядлівасці, рабаванні прыроды, міфах пра тое, што выжывае толькі моцны, хітры, жорсткі. Аднак відавочна, што грамадства, заснаванае на суцэльнай канкурэнцыі і гвалце над прыродай, нежыццяздольнае. Людзі мараць пра іншае.

У пачатку XX ст. народы таксама адчувалі, што капіталізм вычарпаў сябе, і прагнулі свабоды і справядлівасці. Безумоўна, і адрозненняў у гістарычных перыядах, раздзеленых стагоддзем, шмат: па-першае, у пачатку XX ст. людзі жылі ў традыцыйным грамадстве і ў сістэме хрысціянскіх каштоўнасцей, якія адкрывалі *прызначэнне* чалавека. Па-другое, за намі, людзьмі трэцяга тысячагоддзя, – трагічны вопыт цэлага стагоддзя, самага катастрафічнага, антыгуманнага ў гісторыі, – нягледзячы на ўсе прыгожыя лозунгі пра дэмакратыю і свабоду. Але тым больш варта зазірнуць у пачатак XX ст., разгледзець тэндэнцыі, што пачалі развівацца ў гады, калі ў літаратуру ўступіў будучы класік Якуб Колас.

У ацэнцы дзейнасці пісьменніка неабходна ўлічваць не толькі гістарычныя цыклы, але і іншыя фактары: унікальнасць Расійскай імперыі, у склад якой тады ўваходзіла Беларусь; адметнасць самой Беларусі з яе драматычным лёсам; нарэшце, уласны жыццёвы шлях чалавека на фоне гістарычных падзей.

XX ст. – новы і надзвычай важны этап у развіцці ўсёй айчыннай культуры. Народ доўга назапашваў цывілізацыйны, мастацкі вопыт, у тым ліку і ў форме фальклору, каб у XXI ст. перайсці на якасна новы этап свайго існавання. Асаб-

ліва плённым быў пачатак стагоддзя. У рускай літаратуры ён называўся Сярэбраным векам (Залаты век – у XIX ст.), а ў Беларусі – перыядам нацыянальнага адраджэння.

У гісторыі чалавецтва ўжо здараліся эпохі, калі амаль адначасова працавалі шмат якія найвыдатнейшыя дзеячы навукі і мастацтва. Філосафы гавораць пра нараджэнне талентаў *плеядамі*, што звязана, відаць, з пэўнымі касмічнымі (сонечнымі) цыкламі ці асаблівымі, яшчэ не пазнанымі, заканамернасцямі ў развіцці цывілізацыі. Напрыклад, плеяда геніяў вызначае ўзлёт грэчаскай антычнасці – у V ст. да н. э., калі былі створаны шэдэўры трагедыі і камедыі, архітэктуры і скульптуры. Або эпоха еўрапейскага Рэнесансу – у XIV–XVI стст., якая таму і называецца Адраджэннем, што адраджала мастацкія традыцыі Антычнасці. І хоць на тэрыторыі Беларусі не квітнела антычная культура (ва ўсялякім разе, сведчанняў пра гэта пакуль не знойдзена), але і ў нас літаратура XII–XIII стст. перажывала росквіт, таму было што адраджаць у XVI ст., калі наша краіна адчула на сабе ўплыў еўрапейскага Рэнэсансу. Прычым лепшыя сыны беларускага народа – Францыск Скарына і Мікола Гусоўскі – не толькі выхоўваліся на ўласнай культуры перыяду Старажытнай Русі, але былі знаёмы і з антычнай спадчынай, і з Бібліяй, і з сучаснай ім культурай Еўропы. Гэта і абумовіла велізарную ролю творчасці названых асоб не толькі ў свой час, але і некалькімі стагоддзямі пазней. Беларускае нацыянальнае адраджэнне пачатку XX ст. як бы аднаўляла, адраджала, працягвала іх традыцыі ў айчыннай культуры. І на аснове ўласных традыцый выбудоўвала сваю мару – *нацыянальную ідэю*.

У пачатку XX ст. у Беларусі ўжо вырасла свая народная інтэлігенцыя, якая прагнула рэалізаваць уласныя творчыя магчымасці: імкнулася пісаць літаратурныя творы, ставіць тэатральныя пастаноўкі, маляваць. Але ў першыя гады XX ст. сцвярджаць сябе ў соцыуме таленавітыя людзі, асабліва пісьменнікі, не маглі, бо, як і ў XIX ст., існавала забарона друкаваць творы на беларускай мове. Аднак у 1905–1907 гг. у Расійскай імперыі адбыўся магутны сацыяльны катаклізм – першая руская рэвалюцыя. Гэта быў узрыў народнага гневу, болю, адчаю, выкліканы і паразай у руска-японскай вайне, і "крывавай нядзеляй" (правакацыяй пэўных радыкальных сіл), а галоўнае – беднасцю, галечай працоўных людзей, гвалтам над простым чалавекам з боку чыноўнікаў і багацеяў.

Спалоханы выбухам пратэсту, імператар Расіі Мікалай II у кастрычніку 1905 г. аб'явіў канстытуцыю, якая абвясціла шмат якія свабоды, у тым ліку і свабоду слова. Гэта адразу дало магутнейшы штуршок развіццю літаратуры на Беларусі. Прычым беларускія пісьменнікі, у тым ліку будучыя класікі (Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч, М. Гарэцкі), кіраваліся ў сваёй творчасці ідэямі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення, а іх творы, у сваю чаргу, уздымалі народ на барацьбу, выхоўвалі патрыятычныя пачуцці.

Паэма Якуба Коласа "Новая зямля" стваралася на пераломе эпох і стала адной з важнейшых вех у гісторыі беларускай літаратуры; яна аказала велізарны ўплыў на ўсю паслякастрычніцкую паэзію і прозу. Праўда, ацэнены твор па-сапраўднаму быў не ў 1920-я гг., а значна пазней.

Вядома, што першыя восем вершаваных апавяданняў Якуб Колас напісаў яшчэ да рэвалюцыі 1917 года, адбываючы пакаранне ў Мінскай турме, дзе ўспаміны дзяцінства аказаліся адзіным псіхалагічным паратункам.

Спачатку паэт занатоўваў найбольш яркія ўражанні маленства, якія трывала захоўваліся ў памяці, затым, мяркуючы па ўсім, у яго стала выспяваць задума маштабнага твора, прысвечанага найперш бацьку – лесніку на службе ў князёў Радзівілаў. Якуб Колас адчуваў свой сыноўні абавязак перад бацькам, які рана памёр. Асабістыя пачуцці любові і замілавання – па меры абдумвання твора – набывалі большую глыбіню, розныя нюансы. Пісьменнік зразумеў, што аповед пра прыватнае жыццё простай сям’і можа быць цікавы і для іншых людзей. Чытаючы любы літаратурны твор, чытач адчувае задавальненне, з аднаго боку, ад матэрыялу блізкага і знаёмага з яго ўласнага жыцця, а з другога боку, новага і незвычайнага, чаго яму асабіста зведаць не давялося. Гэта глыбока *фізіялагічны, псіхалагічны закон*: нейроны мозгу, каб нармальна функцыянаваць, павінны бачыць, распазнаваць ужо знаёмае, але ім неабходна і расці, злучацца з іншымі нейронамі, а для гэтага патрабуецца новая інфармацыя.

Сям’я самога Якуба Коласа – тыпова сялянская і жыла як тысячы, сотні тысяч сялянскіх сем’яў. Праўда, толькі адзінкі з сялян знаходзіліся на службе – ці ў дзяржаўных установах, ці ў прыватных уласнікаў, як Міхал Міцкевіч у Радзівілаў. Такое дваістае палажэнне ўжо рабіла лёс селяніна незвычайным, дадавала драматызму ў яго існаванне. Тым больш што бацька паэта быў яўна чалавек неардынарны. Зняволены ў засценку, пакараны за сваю мару аб справядлівасці (самую высакародную мару ў свеце), Якуб Колас прагнуў свабоды і таму лепш разумеў уласнага бацьку, які таксама жыў думкай пра волю, хоць і не знаходзіўся за кратамі. Воля для чалавека, які вымушаны служыць, каб карміць сям’ю, заключалася ва ўласнай маёмасці, у дадзеным выпадку – зямлі. Паэма задумвалася як твор пра свабоду, а свабоду бацькі паэта звязвалі з зямлёй, маючы, бясспрэчна, на гэта рацыю.

У савецкі час Канстанцін Міхайлавіч вярнуўся да сваёй задумы: у 1919–1923 гг. напісаў яшчэ дзевятнаццаць раздзелаў і перапрацаваў некаторыя з тых, што стварыў у турме. Твор выкрышталізаваўся, набыў цэласнасць і глыбіню.

Якуб Колас пісаў паэму, прайшоўшы праз імперыялістычную вайну, якая потым атрымала назву Першай сусветнай, перажыўшы Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі, а затым і Грамадзянскую вайну. Усе названыя падзеі парушылі звычайны, натуральны ход жыцця. Для нармальнага чалавека, які не назіраў збоку, па-філасофску асэнсоўваючы, гісторыю, а жыў, так бы мовіць, унутры сацыяльна-палітычных працэсаў, уласнае існаванне ўяўлялася хаосам, поўным бязладдзем і панаваннем дзікіх, неўтаймаваных, варожых асобе сіл. Праблемай стала ўсё – ежа, самыя звычайныя рэчы ўжытку, жыллё, праца. І хоць у цэлым панаваў гістарычны аптымізм і вера ў лепшае будучае, сталыя, разважлівыя людзі, да якіх, бясспрэчна, належаў Якуб Колас, усё больш адчувалі тугу па стабільнасці, нармальнасці, прытулку. А што можа быць больш нармальным, чым праца на зямлі, жыццё на ўлонні прыроды? “Новая зямля” народжана настальгіяй не толькі па ўласным маленстве, але найперш – па *ладу*, бо лад, у народным уяўленні, – гэта гарманічнае, зладжанае ўнутры прыроды і ўнутры соцыуму паўсядзённае жыццё.

Гарантам такога жыцця спрадвеку была зямля. Чалавек на ўласнай зямлі – як немаўля ва ўлонні маці. Нездарма Якуб Колас піша, што зямля «дасць моцы, дасць і сілы». Сюжэтам даволі вялікай па памеры паэмы з’яўляецца *мара* лесніка Міхала аб набыцці кавалка зямлі, сваёй, уласнай, каб яна стала мацярынскай для яго дзяцей, усіх нашчадкаў, а ў больш шырокім плане, як мы зразумелі сёння, – з’явілася гарантам незалежнасці і ўмовай выжывання этнасу.

Пішучы паэму ў разбураным, хаатычным свеце, Якуб Колас спадзяваўся на норму, парадак; даваў і прыклад, хоць вельмі добра разумеў шматлікія заганы жыцця ў былой Расійскай імперыі, залежнасць простага чалавека ад несправядлівых законаў, ад самаўладдзя чыноўнікаў, ад глупства, якое непазбежна праяўляецца ў складана арганізаваных сацыяльных сістэмах, урэшце, ад розных выпадковасцяў. Вось чаму паэма канчаецца трагічна: Міхал не паспеў купіць зямлю – памёр, мара не здзейснілася.

Мара, у адрозненне ад утопіі, якая заўсёды – выключна рацыянальны канструкт, – агорнута паэзіяй, рамантычным адчуваннем жыцця. “Міхал аказаўся таксама, як і Антось, паэтам, які ў мары пра сваю зямлю бачыў адзін-адзіны выхад са становішча. Душа герояў паэмы перапоўнена любоўю да зямлі…” [5, с. 212]. А толькі ў стане замілаванасці і любові і магчыма марыць.

У назве паэмы можна бачыць розныя сэнсы: і палажэнне, у якім знаходзілася на момант заканчэння твора радзіма аўтара ў параўнанні з яго ж уласнымі ўспамінамі, і мара герояў паэмы і самога паэта аб шчасці, і агульначалавечая туга па ідэалу.

Аляксандр Праханаў лічыць, што, у адрозненне ад амерыканскай мары, якая – “горад на ўзгорку”, руская мара – “храм на ўзгорку”. А беларуская, на нашу думку, – “дом на ўзгорку”, абмежаваная пэўная прастора (“родны кут”) – зямля як прытулак, як канцэнтрацыя народных спадзяванняў. Мы мяркуем, што паэма, чаго, мажа, і сам аўтар не ўсведамляў, – *мара народа пра самога сябе*, у якой – і адчуванне ўласнага “ўмяшчальнага ландшафту” (Л. Гумілёў), і любоўзамілаванне да яго, і памяць пра спрадвечнае жыццё на *уласнай* тэрыторыі, якая толькі і дапамагла захавацца беларусам як этнасу. Інакш кажучы, мы – не качэўнікі, мы тут жылі, мажа, яшчэ ад неўраў. І таму зямля для народа – паняцце *сакральнае* нават у пазітывісцкіх, секулярных XIX і XX стагоддзях. І адпаведна яна сакральная для кожнага асобнага чалавека, кожнай сям’і. Сакральнасць у дадзеным выпадку – і канкрэтнасць, мара пра прытулак, і абагульненне адначасова. “Мы заключаем законы прасторы і часу ў саміх сабе… Свет шырокі, але ў нашых душах ён глыбокі, як мора. У душы прыхаваны законы, на якіх заснаваны сусвет. Разгадваючы яго незвычайныя таямніцы, мы аднаразова пазнаем нешта пра ўласную незвычайнасць і загадкавасць” [2, с. 226]. Для людзей характэрна міфалагічная свядомасць. Міфы не варта разумець залішне літаральна, сюжэтна – гэта заўсёды сімвалы, абагульненні, агорнутыя моцнымі эмоцыямі. І па вялікаму рахунку, Рай у марах літаральна ўсіх народаў свету – не пэўная далёкая прастора (дзе-небудзь у Месапатаміі), а сад душы. Эдэм унутры нас. Ён і ўвасабляецца ў марах пра жыццё хатняе, сямейнае.

Уся мастацкая тканіна паэмы накіравана на зберажэнне народных традыцый, у тым ліку спрадвечнай мары, а значыць, саду душы. Пры гэтым філасофская сутнасць мары – *захаванне народа* на яго роднай тэрыторыі і ў тым выглядзе, якое робіць яго непаўторным. “Сваёй паэмай Якуб Колас сцвярджае, што сялянскі свет можа стаць той асновай, на якой трэба будаваць новае грамадства. На жаль, голас песняра пачуты не быў” [3, с. 185]. Але ён не быў пачуты *тады*. Сёння шмат хто з беларусаў марыць пра ўласную зямлю, утульную сядзібу, лецішча, жыццё на ўлонні прыроды. Мары часам спраўджваюцца – назіраецца тэндэнцыя перасялення з гарадоў.

Значэнне паэмы ў тым, што яна паказвае жыццё ў яго асновах, абсалютнай норме, прычым паказвае цэласна, не вырываючы кавалкі з асобных сфер рэальнасці і тым больш не імітуючы іх. Так, як жылі героі паэмы, сялянства жыло

спрадвеку. Больш за тое, і сёння, каб існаваць, неабходна вярнуцца да зямлі, прыкласці да яе працу, а галоўнае, тую любоў, якую адчувалі да яе нашы продкі і якая – менавіта любоў! – дапамагала захавацца беларускай нацыі, бо любоў з усіх пачуццяў валодае асабліва моцнай энергетыкай, здольнай нават уплываць на сусвет. Безумоўна, у наш час на вялікіх палях буйных гаспадарак працуюць машыны. Навейшую тэхніку прыватныя асобы выкарыстоўваюць і на ўласных падворках, на лецішчах. І гэта добра. Але спецыфіка сельскай гаспадаркі такая, што асобная жывёла, нават асобная расліна патрабуюць карпатлівай увагі, індывідуальнага падыходу. І тады вяртаецца неабходнасць у выкарыстанні *тых жа* прыёмаў і нават *тых жа* інструментаў, што ўжывалі героі паэмы Якуба Коласа. “Вілы, граблі і мяцёлкі” і сёння ёсць на кожнай вясковай сядзібе, на лецішчах гараджан.

“Новая зямля” – паэма энцыклапедычная па адлюстраванні ўсіх бакоў вясковага існавання, прытым працяглая ў часе менавіта сваёй універсальнасцю. Для гараджан, якія вяртаюцца на зямлю, паэма раптам адкрывае незвычайны, новы для сучасных людзей эстэтычны свет, стылістыку жыцця. З вялікай мастацкай сілай тут знітаваны духоўны свет герояў, хараство беларускай прыроды, багацце народных традыцый і мовы. Якуб Колас сцвярджае думку, што чалавек здольны зрабіцца асобай, знайсці гармонію ва ўласнай душы толькі ў *арганічным для сябе асяроддзі*. А з другога боку, адносіны да зямлі, пэўны сельскагаспадарчы вопыт з’яўляюцца неад’емнай часткай культуры народа і адначасова асновай яго жыццядзейнасці.

На пачатку трэцяга тысячагоддзя мысляры, шэраг вучоных, пісьменнікі ўсё часцей гавораць пра недастатковасць навукова падзеленага разумення свету, раз’яднання яго на часткі, заклікаюць да *з’яднання* структурных яго элементаў, спадзяюцца на ўсё большае набліжэнне адно да аднаго навукі і рэлігіі, нават гавораць пра іх сінтэз як верагоднае *асноўнае дасягненне* XXI стагоддзя. Аднак найбольш цэласную карціну свету ў яго шматлікіх сувязях дае *мастацтва* – такія геніяльныя творы, як “Новая зямля”. Зямля ў разуменні Якуба Коласа – садружнасць. Аўтар паказаў садружнасць элементаў прыроды на зямлі, але марыў, каб тое ж было ў соцыуме, а таксама паміж соцыумам і прыродай.

Паэма “Новая зямля” – твор пра мару героя, твор, у якім увасоблена мара геніяльнага мастака, твор і пра нацыянальную ідэю – мару, якая дазваляе захавацца нацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Воеводина, Л. Н.* Мифология и культура / Л. Н. Воеводина. – М. : Наука, 2002.
2. *Кэмпбелл, Дж.* Мифы, в которых нам жить : пер. с англ. / Дж. Кэмпбелл. – Киев : София, 2002.
3. *Навуменка, П. І.* Якуб Колас / П. І. Навуменка // Беларуская літаратура. XI–XX стст. / А. І. Бельскі [і інш.]. – Мінск, 1999.
4. *Проханов, А.* Что есть мечта? Разговор о смысле жизни / А. Проханов // Завтра. – 2018, сент. – № 36.
5. *Тычына, М.* Якуб Колас / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. Акад. навук Беларусі ; Ін-т літ. імя Янкі Купалы. – Мінск, 1999. – Т. 1.